По определению Н. Д. Гальсковой и Н. И. Гез, изучающее чтение «проводится на текстах, обладающих познавательной ценностью и информативной значимостью, достаточно трудных в языковом отношении» [4], другими словами, это чтение с элементами анализа и со словарем по критерию использования логических операций в процессе осуществления данного вида речевой деятельности.

Анализ текстов из художественной литературы посредством изучающего чтения предполагает «извлечение выразительных средств иностранного языка; изучение лексики и фразеологии; понимание стилистических особенностей лексики иностранного языка; усвоение лексики с национальнокультурным компонентом; получение знаний о стране изучаемого языка, страноведческих сведений, затрагивающих разные стороны ее жизни» [2, с. 25].

Исходя из вышеуказанного, содержание работы по развитию навыков изучающего чтения текстов с национальным компонентом направлено на:

а) развитие лингвистических способностей учащихся;

б) пополнение словарного запаса учащихся за счет информации лингвострановедческого и литературоведческого характера (быт, история, культурное наследие страны);

в) формирование лингвистических компетенций:

– умений выделять существенные признаки, особенности функционирования иностранного языка в текстовом материале;

– умений сравнивать и противопоставлять языковые средства родного и иностранного языков;

– умений понимать семантику слов по контексту;

– умений устанавливать смысловые отношения между словами в контексте;

– умений выделять предложения, несущие основную смысловую нагрузку, опорные вехи в виде ключевых слов, фраз в каждом из коммуникативнозначимых частей в читаемом [2].

**Заключение**. Таким образом, возможности изучающего чтения в подготовке обучающихся к межкультурной коммуникации велики. При анализе иноязычного текста формируется образ мира, соответствующий социальным, политическим и культурным реалиям современной действительности родной страны и стран изучаемого языка.


1. Полат, Е. С. Обучение в сотрудничестве / Е. С. Полат // Иностранные языки в школе. – 2000. – № 1. – С. 4–7.
2. Демченко, А. И. Изучающее чтение иноязычных текстов как средство формирования коммуникативной компетенции учащихся старших классов / А. И. Демченко, Н. С. Алипулатова // Изв. Дагест. гос. пед. ун-та. Психол.-пед. науки. – 2019. – Т. 13. – № 1. – С. 24–29.
3. Азимов, Э. Г. Новый словарь методических терминов и понятий / Э. Г. Азимов, А. Н. Щукин. – М. : Изд-во ИКаР, 2009. – 448 с.
4. Гальскова, Н. Д. Теория обучения иностранным языкам. Лингводидактика и методика / Н. Д. Гальскова, Н. И. Гез. – М. : Academia, 2006. – 336 с.


## ЖАНОЧЫЯ ВОБРАЗЫ Ў АПОВЕСЦЯХ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА “ЧАЗЕНІЯ’’, “ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА”, “ЛАДДЗЯ РОСПАЧЫ”


***Карповіч Д.У.,***
*студэнтка 3 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Гладкова Г.А., канд. філал. навук, дацэнт


Жанчына як мастацкі вобраз стала разглядацца з пачатку стварэння мастацтва. Менавіта па гэтай прычыне жанчыну як ідэал прыгажосці, можна сустрэць у розных сферах творчасці: у жывапісе, музыцы, скульптуры, балеце. Калі ж казаць пра літаратуру, то да гэтага вобраза майстры слова апелявалі ўжо на этапе яе зараджэння (як прыклад, каларытны і цікавы вобраз Пенелопы ў “Адысеі’’ Гамера). Выдатныя

жаночыя вобразы ствараліся і ў эпоху Сярэднявечча і Адраджэння (вобраз Лауры ў Франчэска Петраркі), і ў перыяд рамантызму (Марыля Верашчака ў Адама Міцкевіча).

Актуальнасць працы ў тым, што вобраз жанчыны апісваецца ва ўсе часы існавання мастацтва і літаратуры, а таксама з'яўляецца прадметам даследавання многіх мастакоў, пісьменнікаў, навукоўцаў. Мэта даследавання – вызначыць адметнасці адлюстравання цэнтральных жаночых вобразаў у аповесцях У. Караткевіча **"**Чазенія**''**, **"**Дзікае паляванне караля Стаха**''**, **"**Ладдзя роспачы**''**.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужылі аповесці "Чазенія'', "Дзікае паляванне караля Стаха'', "Ладдзя роспачы'' У. Караткевіча. Даследаванне праведзена з выкарыстаннем элементаў канкрэтна-аналітычнага і структурна-тыпалагічнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Да апісання жаночых вобразаў звярнуўся і таленавіты паэт, празаік, драматург Уладзімір Караткевіч, які ў сваіх творах апявае, узвышае жаночыя вобразы, бо лічыць іх эталонам прыгажосці, мудрасці, дабрыні і нават мужнасці.

Цэнтральным жаночым вобразам ў аповесці "Чазенія'' з'яўляецца Гражына Арсайла. Яна па прафесіі натураліст, выдатна разбіраецца ў сваёй справе і ведае шмат відаў раслін і жывёл. Гэта вельмі прыгожая жанчына, якая з першага знаёмства зачаравала хіміка Севярына Будрыса сваёй прывабнай знешнасцю: *"Вочы цёмна-сінія, валасы залацістыя. Але чароўнасць гэтага аблічча была не ў тым, не ў нейкай там прыгажосці або нават правільнасці рысаў, а ў той самай зменлівасці – выяўляецца, заўсёднай, – у цякучасці выразу, у тым, што мілая ўсмешка змяняла годную строгасць, а на яе месца прыходзіла амаль дзіцячая ўвага, каб саступіць у сваю чаргу хлапечай дзёрзкасці або дзявочай цёплай пакоры''* [1, с. 290-291].

Прывабны і характар Гражыны, у якім прасочваюцца такія якасці, як упартасць у поглядах, размеранасць, упэўненасць, і гэта таксама праяўляецца ў знешнасці: *"Жанчына хораша ішла. Гэта не быў часты і дробны поступ гараджанкі. Гэта была плаўная і размераная, няспешная, эканомная і вельмі прыгожая хада чалавека, якому падоўгу і памногу даводзіцца хадзіць, які любіць і ўмее хадзіць''* [1, с. 290].

Таксама на чароўнасць жанчыны, яе прыгажосць, пяшчоту, паказвае тое, як Севярын параўноўвае сваю каханую з чазеніяй. Такая ж дзіўная, непаўторная, як гэтае дрэва: *"А вы хіба чалавек? Вы проста першая чазенія. Высокая чазенія. Страйнюткая чазенія. Чазенія, якая памагае ўсім. А раз усім, то і мне''* [1, с. 343].

Па характары Гражына добрая, чуллівая жанчына, ідзе на дапамогу ўсім, але ў пытаннях, якія датычацца кахання, – неадназначная асоба. Яна мае моцныя пачуцці да Севярына, хоча быць побач са сваім каханым усё жыццё. Аднак у той жа час Гражына разумее, што яны не застануцца разам, што такое моцнае каханне не зможа быць усё жыццё і абавязкова згасне, а гэтага яна не перажыве. Таму жанчына паспешліва ўцякла ад свайго мужчыны: *"Я баюся. Памятаеш, калі джунглі віліся над намі? Я хацела, каб ты вечна пра мяне думаў, каб гэта ніколі не мінулася. І я дрыжала ад думкі, што гэта мінецца. Я не перанесла б гэтага... Але кожны дзень на зямлі памірае каханне, і людзі абыякава праходзяць паўз дарагія калісь магілы. Я не магла б. Даруй мне. Я не жыла б пасля і хвіліны''* [1, с. 393]. Вобраз Гражыны Арсайлы рэпрэзентуе такія важныя якасці, як дабрыня, чуллівасць, неабыякавасць да людзей, якія знаходзяцца побач.

Галоўным жаночым вобразам у аповесці **"**Дзікае паляванне караля Стаха'' з'яўляецца Надзея Яноўская. У старым замку жыве юная Надзея Раманаўна Яноўская – апошні нашчадак старажытнага шляхецкага роду: *"Гэта была прыгажосць незямная, замучаная, з горкімі вуснамі і вялікімі чорнымі сухімі вачыма''* [2, с. 277].

Маладую дзяўчыну катавалі шляхціцы з-за яе спадчыны і пужалі старажытным паданнем. Паводле легенды, калісьці продак Надзеі Раман прывабіў на паляванне і паздрадніцку забіў легендарнага караля Стаха. Паміраючы, кароль напрарочыў праклён

і вечную помсту "дзікага палявання" ўсяму роду Яноўскіх. Апошняй ахвярай павінна стаць Надзея. Аднак Яноўская не баялася нічога і змагалася да канца. У яе характары прасочваюцца такія рысы, як стойкасць, мужнасць, духоўная моц, якія не заўсёды характэрны для дарослага мужчыны, не тое, што для васямнаццацігадовай дзяўчыны. Нягледзячы на ўсе перашкоды, Яноўская не збягае, а застаецца вернай сваёй мэце – сваім жыццём выкупіць грэх далёкага продка. Думаецца, праз вобраз Яноўскай Караткевіч хацеў паказаць мудрую маладую дзяўчыну, якая ўшаноўвае старадаўнія традыцыі.

Цэнтральнымі жаночымі вобразамі ў аповесці "Ладдзя роспачы" з'яўляюцца Бярозка і Смерць. Бярозка – язычніца сямнаццаці год – сапраўднае дзіця сваёй зямлі: "*Вочы ясныя – нібыта нехта шухнуў крынічнай вадою на торн, – вялікія і прыгожыя і такія ж добрыя*" [3, с. 124]. Калі яна патрапіла на ладдзю роспачы, дзяўчына не ведала сапраўднага жыцця, але адразу згадзілася аддаць яго за свайго каханага. І ў гэтым вобразе прысутнічае адданасць і вернасць, мужнасць і духоўная моц.

Вобраз Смерці паказваецца ў творы як вобраз жанчыны, якая кіруе ўсімі міфічнымі істотамі. Духоўны свет Смерці пабудаваны на нянавісці да чалавечага роду. Таму яна са сваімі падданымі знішчае яго. Але Смерць з недаверам ставіцца да беларусаў, бо гэты народ валодае такой вялікай прагай жыцця і любоўю да зямлі, што нават найвышэйшая сіла не мае над імі ўлады. Смерць не верыць, што чалавецтва можна выправіць і зрабіць з яго нешта маральнае, карыснае і нават якаснае. У творы Смерць гуляе з чалавекам у шахматы, і яна ставіць на кон жыццё. Аднак у выніку гульні перамагае Гервасій Выліваха.

**Заключэнне.** Вельмі яскрава і арыгінальна раскрыў жаночыя вобразы ў сваіх творах Уладзімір Караткевіч. Пісьменнік адлюстраваў усю веліч і прыгажосць беларускіх жанчын, адзначыўшы іх духоўную моц, маральную і знешнюю прыгажосць. Вобраз жанчыны аўтар увасабляе як эталон дабрыні, сумлення, праўдзівасці, мудрасці, творчага пачатку і нават мужнасці, хоць апошняя якасць традыцыйна прыпісваецца мужчынам.

1. Караткевіч, У. Чазенія : апавяданні і аповесць : для сярэд. І ст. шк. узросту / У. Караткевіч; прадм. Дз. Бугаёва. – Мінск: Маст. Літ., 2007. – 398 с. – (Бібліятэка школьніка).
2. Караткевіч, У. Дзікае паляванне караля Стаха: аповесць ; Зямля пад белымі крыламі : нарыс : для ст. шк. узросту / У. Караткевіч ; прадм. А. Расінскага. – Мінск : Маст. Літ., 2008. – 493 с.
3. Караткевіч, У. Сівая легенда. Ладдзя Роспачы. Цыганскі кароль / У. Караткевіч. – Мінск : Папуры, 2018. – 240 с.
4. Нікалаева, І.У. Рэпрэзентацыя жаночага вобразу ў савецкім перыядычным друку ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі / І.У. Нікалаева // Наука – образованию, производству, экономике : материалы 74-й Региональной научно-практической конференции преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 18 февраля 2022 г. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2022. – С. 127-129. – URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/31619 (дата обращения: 10.03.2024).

## ПРЭЦЭДЭНТНЫЯ ІМЁНЫ ДЗЕЯЧАЎ КУЛЬТУРЫ Ў ПАЭЗІІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

***Карповіч Д.У.,***
*студэнтка 3 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Дзядова А.С., канд. філал. навук, дацэнт

Уладзімір Караткевіч – знакавая постаць у гісторыі беларускай літаратуры. Пісьменнік меў шырокі мастацкі кругагляд, што пацвярджаецца зваротам у вершах да слынных дзеячаў беларускай і сусветнай культуры. Яго творы тэматычна насычаныя і глыбокія, высокаінтэлектуальныя, вызначаюцца добрым веданнем найлепшых дасягненняў айчыннай і замежнай культуры. Як заўважае А.С. Дзядова, "сёння ўвага даследчыкаў усё больш і больш скіроўваецца на вывучэнне прэцэдэнтных іменаў, якія ўяўляюць сабой складнікі агульных ведаў прадстаўнікоў пэўнай лінгвакультурнай